на коммерческой основе – за деньги заказчика. По образному и меткому выражению – это новый вид криминала.

Его величество Герой, как и факт, отодвинут на второй план не только в официальной и «старой» прессе, но и в неофициальной и «новой». На страницах периодики продолжается шествие его величества доллара как эквивалента власти над словом – оборотной стороны вчерашней цензуры. Установка на информацию без комментария, развитие сугубо информационной и коммуникационной функций прессы обедняют публицистический образ современной картины мира.

Познавательная роль прессы осуществляется посредством публикации новости, заметки, репортажа, интервью, очерка, проблемной статьи, в которых есть идея, есть Герой. Познавательное начало свойственно любому жанру, любой теме – все дело в том, как используется форма, что стоит за содержанием. Создавая искренний, правдивый публицистический образ или портрет Героя, мастер пера сознательно или невольно подразумевает и учитывает и его герменевтический аспект. Только в совершенной и современной форме правда может быть усвоена и воспринята обществом. Эта сторона аналитической журналистики крайне недостаточно изучена и осмыслена как в теории, так и в практике современных массмедиа, что ведет к определенным издержкам творчества в региональной (и не только региональной) прессе.

***Наталля ЗУБЧОНАК***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## АБІТУРЫЕНТ– СТУДЭНТ – ЖУРНАЛІСТ (супрацоўніцтва Інстытута журналістыкі БДУ з рэгіянальнымі СМІ)

Рэалізацыю прыярытэтных нацыянальных праектаў і праграм у сферы адукацыі немагчыма ўявіць без істотных змен у якасці падрыхтоўкі кадраў. Праблема недахопу прафесійных журналістаў у рэгіянальных сродках масасвай інфармацыі

з'яўляецца адной з першасных і для Інстытута журналістыкі. Рэдакцыі раённых газет не поўнасцю забяспечаны спецыялістамі з вышэйшай журналісцкай адукацыяй. На пасадах карэспандэнтаў, загадчыкаў аддзелаў працуюць прадстаўнікі самых розных прафесій. Некаторыя з іх не маюць нават вышэйшай адукацыі і самастойна авалодваюць прафесійнымі навыкамі. Зразумела, што такая сітуацыя не можа лічыцца нармальнай і патрэбна нешта рабіць, каб яна змянілася.

На жаль, зараз працэнт паступлення на факультэт моладзі з рэгіёнаў рэспублікі невялікі. Студэнтамі галоўнай ВНУ краіны становяцца ў асноўным выпускнікі гарадскіх школ. Шматгадовая практыка прыёмнай кампаніі паказвае, што тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца Міністэрствам адукацыі і ўніверсітэтам па падтрымцы таленавітай моладзі, па прафарыетацыі школьнікаў, недастаткова. Абітурыеты з вёсак часцей за ўсё вяртаюцца дадому, не вытрымаўшы ўступных выпрабаванняў.

Некалькі гадоў таму Правілы прыёму ў ВНУ дазвалялі выпускнікам сельскіх школ да набраных на ўступных экзаменах балаў дадаваць яшчэ тры. Праз два гады такая льгота была скасавана. Потым было прапанавана праводзіць асобны конкурс для гарадскіх і сельскіх абітурыентаў. У апошнія гады так і робіцца. На жаль, і гэта не дапамагае вырашыць праблему. Так, у мінулым годзе на спецыяльнасць "Журналістыка" было выдзелена толькі 5 месцаў для сельскіх школ, на астатнія спецыяльнасці толькі па адным. Прахадны бал для такіх абітурыетаў павінен быць, на першы погляд, ніжэйшым, чым у гарадскіх. Але атрымалася, што яны набралі амаль такі ж бал, як і гарадскія абітурыенты. Таму на большасці спецыяльнасцей быў аб'яўлены агульны конкурс.

Можна дапусціць, што выпуснікі сельскіх школ падрыхтаваны лепш, таму і атрымалі больш высокія адзнакі. Але ж гэта не так. Мы ведаем аб праблемах, якія існуюць у сельскіх школах з забеспячэннем настаўнікамі, вучэбна-метадычнай літаратурай, найноўшымі тэхнічнымі сродкамі камунікацыі.

У БДУ выкарыстоўваецца яшчэ адна форма заахвочвання да паступлення – гэта мэтавы кантрактны набор. Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам інфармацыі і ўніверсітэтам распрацоўвае план такога прыёму. Нельга не адзначыць, што гэтыя крокі ў далейшым павінны прывесці да добрых вынікаў. У апошнія гады план павялічваецца. У 2010 г. для факультэта журналістыкі было выдзелена 13 мэтавых месцаў, у гэтым годзе – 12 (у 2007 г. – 9, у 2008 г. – 2). Сёння гэта ўжо рэальныя шанцы для выпускнікоў рэгіянальных школ стаць студэнтамі. Тым не менш узнікае сітуацыя, калі такія выпускнікі журфака не вельмі хочуць потым вяртацца на месцы сваёй працы. Не хапае нечага ў гэтым ланцугу. Магчыма, добрахвотнасці, мэтанакіраванасці самога маладога чалавека на працу там, дзе ён нарадзіўся, дзе яго здольнасці і талент так неабходны людзям.

На гэта ёсць і аб'ектыўныя прычыны. У гарадскога школьніка намнога больш магчымасцей рэалізаваць свае творчыя здольнасці. Што датычыцца супрацоўніцтва з газетамі і часопісамі, студыямі тэлебачання і радыё, то сельскія школьнікі і тут абмежаваны. Новыя сродкі камунікацыі так і застаюцца для многіх з іх нечым недасягальным, непазнаным.

Сёння мы можам адкрыта гаварыць і пра рэальныя матэрыяльныя праблемы, звязаныя з наведваннем рэдакцыі. У рэшце рэшт, аўтобус з аддаленай вёскі да раённага цэнтра ходзіць не больш за адзін-два разы ў суткі, калі не ў тыдзень. Вось і атрымліваецца, што недзе ў перыферыйным рэгіёне рэспублікі жыве таленавіты хлопец ці дзяўчына, але дабрацца да сталіцы ў іх няма магчымасці. Можа стацца так, што малады чалавек і застанецца ў вёсцы (у гэтым няма нічога дрэннага), але яго талент не змогуць ацаніць іншыя, а журналістыка страціць таленавітую асобу (як бы пафасна гэта не гучала).

Разумеючы праблемы, Інстутыт журналістыкі сёння імкнецца дапамагчы тым, хто марыць звязаць сваё жыццё з журналісцкай прафесіяй. Агульнапрызнана, што перш-наперш неабходна наладжваць кантакты з раённымі газетамі. Менавіта яны з'яўляюцца тымі цэнтрамі, вакол якіх аб'ядноўваюцца маладыя

людзі з вёсак у першыя творчыя калектывы. Яны нясуць у рэдакцыю раёнкі свае вершы, невялікія артыкулы. Вельмі важна, каб рэдакцыя газеты валодала ўсёй інфармацыяй пра асаблівасці паступлення на факультэт журналістыкі, каб у любы момант кіраўнік маладзёжнага творчага аб'яднаная мог наладзіць кантакт з ВНУ. А кантакт павінен быць пастаянным. Спачатку гэта праца з абітурыетамі, потым са студэнтамі-практыкантамі і, нарэшце, з маладымі спецыялістамі, якім зноў жа патрабуецца падтрымка.

Раённная газета – школа прафесійнага майстэрства для журналіста. На факультэце ён атрымае неабходныя веды, але як іх рацыянальна выкарыстаць, можна навучыць толькі на месцы, пад кіраўніцтвам вопытных настаўнікаў. Нам неабходна імкнуцца аб'яднаць факультэт і рэдакцыі раённых газет у адно цэлае, каб, па-першае, падрыхтаваць добрых і высокакваліфікаваных журналістаў, і, па-другое, забяспечыць такімі кадрамі рэгіёны рэспублікі. І, бадай, самае галоўнае: такія людзі не будуць скіроўваць свае намаганні на тое, каб застацца ў сталіцы, будуць адчуваць адказнасць за тую справу, якой пачалі служыць яшчэ ў юнацтве.

На працягу 5 гадоў Інстытут журналістыкі актыўна супрацоўнічае з Галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы Мінаблвыканкама. Праведзена не адно мерапрыемства, накіраванае на ўдасканаленне падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў для рэгіянальных СМІ. Першы такі семінар прайшоў у Маладзечне яшчэ ў лютым 2006 г. Потым дзве сустрэчы прайшлі ў Вілейцы ў 2007 і 2008 гг. Цікавае мерапрыемства было праведзена ў Салігорску ў лістападзе 2009 г. Апошняе адбылося ў студзені гэтага года на базе газеты «Жодзінскія навіны». Такія семінары аб'ядноўваюць рэдактараў раённых газет Мінскай вобласці, прадстаўнікоў БСЖ, Мінскага аблвыканкама, рэдактараў рэспубліканскіх маладзёжных газет. Іх удзельнікі сумесна з выкладчыкамі факультэта маюць магчымасць абмеркаваць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у працэсе супрацоўніцтва, падзяліцца меркаваннямі, інфармацыяй аб праблемах і перспектывах сучасных СМІ.

У межах дадзеных мерапрыемстваў праводзяцца выязныя “Дні адчыненых дзвярэй”. Перад абітурыентамі выступае дырэктар Інстытута журналістыкі, загадчыкі выпускаючых кафедраў. Маладыя людзі з першых вуснаў атрымліваюць падрабязную інфармацыю пра факультэт, пра ўмовы паступлення на яго, уважліва выслухоўваюць адказы на хвалюючыя іх пытанні. Як паказвае вопыт, у далейшым яны абавязкова становяцца нашымі студэнтамі.

Практычна пры кожнай рэдакцыі раённай ці абласной газеты працуе школа ці клуб юнага журналіста. Іх удзельнікі маюць магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці, атрымаць грунтоўныя веды па асновах журналістыкі, нарэшце, паспрабаваць сябе ў прафесіі. Галоўным застаецца тое, што маладыя людзі пачынаюць усведамляць сябе часткай сучаснага інфармацыйнага грамадства, прадстаўнікамі “чацвёртай улады”, правільна разумець сутнасць гэтага выразу. Не на апошнім месцы застаецца і выхаваўчая роля гэтых маладзёжных аб’яднанняў. Сучаснай моладзі не хапае прыкладаў патрыятызму, духоўнасці, а без гэтых якасцей сапраўднага журналіста таксама быць не можа. За кожным словам тут – лёс чалавека. Выхоўваць гэтыя якасці трэба таксама ў юнацтве.

Арганізацыя прафарыентацыйных мерапрыемстваў дае магчымасць Інстытуту журналістыкі наладжваць супрацоўніцтва як з Мінаблвыканкамам, так і з іншымі выканкамамі (за апошнія 5 гадоў выкладчыкі Інстытута журналістыкі наведалі ўсе абласныя цэнтры Беларусі, некаторыя з іх па 2-3 разы), рэдакцыямі раённых газет, вырашаць праблему кадравага забеспячэння праз мэтавы кантрактны прыём. Выпускнікі школ своечасова атрымліваюць інфармацыю пра ВНУ, у якой мараць вучыцца.

Ісціна нараджаецца менавіта ў спрэчках, у грунтоўнай размове, накіраванай на вырашэнне праблемы. Хочацца спадзявацца, што рэдакцыі таксама знаходзяць карысць у гэтым дыялогу, які адбываецца толькі з адной мэтай: як дапамагчы самым аддаленым куткам нашай радзімы стаць моцнымі і квітнеючымі.